дня нараджэння Б., прадставіў скульптуру «М.Багдановіч. Прадчуванне» (шамот). *А.М.Коршак.*

**ФРАЛЯНКО́Ў** Аляксандр Міхайлавіч (н. 1956), беларускі жывапісец. Працуе ў розных жанрах станковага жывапісу. У 1981 на Рэсп. выстаўцы выяўл. мастацтва, прысвечанай 90-годдзю з дня нараджэння Б., прадставіў партрэт «М.Багдановіч» (алей, палатно).

*Г.А.Фатыхава.*

**ФРАНКО́** Іван Якаўлевіч (1856—1916), украінскі пісьменнік, вучоны, грамадскі дзеяч. Доктар філасофіі (1893). Ганаровы доктар рус. славеснасці (1906). Пісаў на 3 мовах: укр., польск. і ням. Пры актыўным удзеле і пад рэдакцыяй Ф. выходзілі час. «Громадський друг», «Світ», «Життє і слово», «Літературно-науковий вістник» і інш. Пра тэматычную разнастайнасць і фармальнае наватарства яго паэзіі сведчаць кнігі: «З вершин і низин» (1887), «Зів'яле листя» (1896), «Мій Ізмарагд» (1898), «Semper tiro» (1906) і інш. Поўны зб. тв. Ф. налічвае 50 тамоў. Жыццё і творчасць мастака слова былі прысвечаны абароне нац. культуры і забеспячэнню духоўных патрэб укр. народа.

Б. высока ацэньваў талент і мастацкія дасягненні пісьменніка. На думку Л.*Казыры*, творчыя набыткі ўкр. пісьменніка ў галіне перакладу паўплывалі на фарміраванне метаду перакладчыцкай практыкі паэта. З паэт. спадчыны Каменяра, як наз. Ф. ўкраінцы, Б. перакл. на рус. мову верш «На ріці вавіло́нській», з прозы — апавяданне «Муляр». Празаічнаму перакладу папярэднічала нататка, у якой паэт лаканічна акрэсліў асн. этапы жыццёвага і творчага шляху ўкр. пісьменніка. У заключэнні ён акцэнтаваў увагу на дамінантах стылю Ф.: «По стилю своего творчества Франко — реалист, по своему мировоззрению — народник... «Почерк письма» — если так можно выразиться — у Франко твердый, энергичный и простой, даже несколько грубоватый».



*А.Фінскі. М.Багдановіч. Прадчуванне. 1991.*

У год смерці ўкр. пісьменніка Б. напісаў літ.-крытычны артыкул «Иван Франко». Гэта пашыраны варыянт нап. годам раней уступнага слова да перакладу апавядання «Муляр». Паэт падкрэсліў «незвычайную працаздольнасць і рэдкую разнастайнасць разумовых інтарэсаў» Ф., звярнуў увагу на дасягненні ўкраінца ў розных галінах дзейнасці (паэзія, проза, пераклад, гісторыя і інш.), паслядоўна адзначыў адметна-характэрнае ў яго творчай манеры.

У літ.-крытычных артыкулах, прысвечаных даследаванню ўкраінскага прыгожага пісьменства, Б. нярэдка спасылаецца на працы Ф., падкрэслівае аўтарытэтнасць і кампетэнтнасць іх аўтара. У арт. «В.Самийленко» беларускі крытык палемізуе з Ф., доказна і паслядоўна аргументуючы сваю думку.

Творчасць укр. класіка знайшла адлюстраванне ў публіцыстыцы Б. У арт. «Червонная Русь. Австрийские украинцы» (1914) аўтарам прапанаваны экскурс у гісторыю дзярж. ладу і культурнага жыцця Галіцыі. Імя Ф. названа першым у ліку знакамітых пісьменнікаў гэтай зямлі. У нарысе «Образы Галиции в художественной литературе» (1915) Б. узнаўляе на рус. мове ўрыўкі з многіх знакамітых твораў укр. пісьменніка (аповесць «Великий шум», апавяданні «Лесихины домочадцы», «Мирон», «Сам виноват» і інш.). Багаты цытатны матэрыял з'яўляецца яскравым паказчыкам перакладчыцкага майстэрства Б. і сведчаннем зацікаўленасці творчай асобай Ф. *С.В.Грымута.*

**ФРАНЦУ́ЗСКАЯ ЛІТАРАТУ́РА І М.БАГДАНО́ВІЧ**. Беларускі пясняр ведаў і цікавіўся сусв. л-рай. Як паэт шырокага творчага дыяпазону, ён быў неабыякавы да эстэт. кірункаў і плыней, асабліва да навейшых тагачасных маст. з'яў у блізкіх яму рус. і франц. л-рах. Б. ўласціва дыялагічнасць маст. мыслення, пра што справядліва заўважыў літ.-знавец В.Івашын: «Паэт умеў глыбока суперажываць блізкае, роднае сабе ў іншых культурах, знайсці заўсёды там водгук для сваёй душы. Чуласць да «чужога» як свайго, дыялагічнасць – характэрная асаблівасць яго паэтыкі, мастацкага мыслення...». Таму невыпадкова Б. называюць «першым еўрапейцам у беларускай літаратуры», а ягоную творчасць — «акном у Еўропу» (Р.Барадулін).

Б. — прыхільнік «новага мастацтва», мастацтва «чыстай красы» на бел. прасторы, адстойваў права на абсалютную прыгажосць. Дамінанта яго творчасці – «апалогія красы» (Л.Тарасюк): у мастацкасці, дасканаласці формы, характве зместу. Б. як рэцэнзент гумілёўскага перакладу кн. франц. творцы Т.Гацье «Эмалі і камеі» адзначаў: у ёй «очень много мастерства и очень мало поэзии», а вершы «красивы, но холодны»